УДК 811.161.3

**К. М. Матусевіч**
Аспірант кафедры беларускай і рускай філалогіі,
УА «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна»,
г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік: Солахаў Аляксей Васільевіч, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

## САЦЫЯЛЬНА-МОЎНЫ ПАРТРЭТ ГОРАДА Ў ТУРЫСТЫЧНЫМ БРЭНДЫНГУ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ГОРАДА МАЗЫРА)

*У артыкуле (на прыкладзе горада Мазыра) разглядаецца сацыяльна-моўны партрэт горада праз яго асноўныя рэсурсныя каштоўнасці ў турыстычным брэндынгу. Сістэмна-навуковы падыход да вызначэння сацыяльна-моўнага партрэта горада Мазыра – сэрца Усходняга Палесся – дазволіў выявіць унікальныя аб'екты дадзенай тэрыторыі, якія маюць несумненны інтарэс для турыстаў: найбольш цікавыя этымалагічныя звесткі, адметныя прыродныя мясціны, помнікі гісторыі, аб'екты культуры, рэлігіі, спорту, прамысловасці.*

*Ключавыя словы: этымалогія назвы, перыфразы, гісторыя, археалогія, назвы вуліц, архітэктура, аб'екты культуры, прадпрыемствы.*

### Уводзіны

У сучасным свеце ўсё больш краін і гарадоў мэтанакіравана займаюцца прасоўваннем сваіх тэрыторый і фарміраваннем уласнага брэнда, якія абумоўліваюць турысцкую прыцягальнасць мясцовасці [1].

Брэндынг (англ. *branding*) з'яўляецца працэсам па стварэнні, узмацненні і падтрымцы брэнда і «ўключае сумеснае ўздзеянне ўсіх відаў маркетынгавых камунікацый (рэкламы, PR, стымуляванне збыту, прамых пісьмаў), асабістых зносін і спонсарства» [2, с. 68]. «У аснове брэндынгу рэгіёна, – адзначаюць даследчыкі, – ляжыць выкарыстанне тэхналогій стварэння яго адрознівальнага вобраза і фарміраванне да яго адносін канкрэтнай мэтавай аўдыторыі» [3, с. 1165].

Як заўважыў А. П. Панкрухін, брэнд рэгіёна як турысцкай тэрыторыі выражае асноўныя каштоўнасці тэрыторыі, яе мэты, місію ў турызме і, акрамя вышэйпералічанага, асноўныя тыпы турысцкіх рэсурсаў [4]. Таму асноўная задача фарміравання брэндынгу турысцкай тэрыторыі – гэта паказ унікальнасці дадзенай тэрыторыі для турыстаў, вылучэнне фактаў пра найбольш цікавыя мясціны, багатыя прыродныя рэсурсы, славутыя помнікі гісторыі, прыроды, аб'екты культуры, рэлігіі і інш.

На Беларусі такая праца толькі-толькі пачынаецца. Таму актуальнасць нашага даследавання відавочная.

Мэта даследавання – вызначыць сацыяльна-моўны партрэт горада Мазыра праз яго асноўныя рэсурсныя каштоўнасці як турысцкай тэрыторыі.

### Метады і метадалогія даследавання

Метадалагічнай асновай вызначэння асноўных рэсурсных каштоўнасцей горада Мазыра як турысцкай тэрыторыі для складання яго сацыяльна-моўнага партрэта з'яўляецца сістэмны падыход, у межах якога выкарыстоўваюцца метад тэарэтыка-метадалагічнага аналізу навуковых і навукова-папулярных крыніц (энцыклапедый, хронік, манаграфій, навуковых і публіцыстычных артыкулаў, архіўных дакументаў і інш.), сістэматызацыя, абагульненне, апісанне і прагназаванне выкарыстання інфармацыі ў турыстычным брэндынгу.

### Вынікі даследавання і іх абмеркаванне

Важнымі складнікамі сацыяльна-моўнага партрэта горада ў турыстычным брэндынгу, на наш погляд, з'яўляюцца этымалогія назвы і апісальныя назвы (перыфразы) горада, асаблівасць пейзажу, гісторыя горада, аб'екты археалогіі, рэлігіі, культуры, архітэктуры, прамысловасці), людзі, якія праславілі горад, адлюстраванне падзей, што адбываліся ў горадзе, у творах літаратуры і мастацтва.

Разгледзім сацыяльна-моўны партрэт горада Мазыра.

Мазыр з'яўляецца горадам абласнога падпарадкавання, цэнтрам Мазырскага раёна. Ён размешчаны па абодва берагі ракі Прыпяці і знаходзіцца за 133 км ад Гомеля, 7 км ад чыгуначнай станцыі

© Матусевіч К. М., 2024

МГПУ им. И.П. Шамякина

Калінкавічы. На р. Прыпяць у мікрараёне Пхоў маецца рачны порт [5, с. 512]. Улетку турысту можна палюбавацца на наваколле Мазыра: ад тэрыторыі гарадскога парка па рацэ адпраўляецца прагулачны кацер. Круглы год ваколіцы горада можна аглядаць з акна трамвая, які курсіруе паміж горадам і мясцовым нафтапера працоўчым заводам.

Пра паходжанне назвы горада існуе некалькі версій. Паводле адной з іх назва бярэ пачатак ад этноніма *мазуры* – этнаграфічнай групы заходнеславянскага (польскага) насельніцтва, аснова «*мазур*» таксама разглядаецца як старажытнафінская, запазычаная балцкімі мовамі [6, с. 35]. Паводле другой, назва магла быць запазычана з іранскіх моў, дзе «*мазар*», «*мосар*» ці «*мазор*» – старажытныя пахаванні, курганы, пагоркі [7, с. 32]. Паводле трэцяй версіі, у старажытнаскандынаўскай мове «*масур*» азначае «клён», а «мосыр» – «сырасць» [6, с. 35].

Вядомы этнограф і краязнавец П. М. Шпілеўскі выказваў меркаванне, што назва горада паходзіць ад назвы маленькай рачулкі, якая ўпадае ў Прыпяць, *Монжыр'е*. Ён таксама ўзгадваў паданне, паводле якога, у старажытныя часы ў раёне Мазыра жылі два браты, якія пасварыліся з-за маёмасці, і кожны з іх імкнуўся даказаць, што яна належыць яму, і таму абодва крычалі: «Мой жыр!» Адсюль і пайшла спачатку назва Можыр, потым – Мозыр [8, с. 223].

Легенды даюць цікавую інфармацыю пра паходжанне асобных частак горада. У адной з іх апавядаецца, што ў спрэчку братоў умяшалася вядзьмарка, якая «прапанавала малодшаму брату перанесці свой дом на яе частку гары, але ён адмовіўся, і, падманутая ў сваіх спадзяваннях, яна, назло яму, сама пасялілася на процілеглай палове рассечанай гары і доўга не пераставала мучыць яго чарамі. Урэшце малодшы брат па прапанове жонкі зрабіў і паставіў крыж на сваёй частцы гары, і вядзьмарка не мела магчымасці дакранацца да святога месца» [8, с. 222]. Узгорак, дзе жыла вядзьмарка, пазней назвалі *Шайтан-гарой.*

Вялікае значэнне ў турыстычным брэндынгу маюць перыфразы – апісальныя назвы горада, якія ярка і дакладна характарызуюць яго. Так, Мазыр называюць *беларускай Швейцарыяй* [5, с. 519] за тое, што ён размешчаны на пагорках Мазырскай грады, якія ўзвышаюцца сярод Палескай раўніны; *Жамчужынай Палесся* [9, с. 106]; *сталіцай ўсходняга Палесся* [10, с. 26]. Паэт Уладзімір Верамейчык называе яго *мой Парнас* [11, с. 10]. Ён прысвяціў гораду шмат сваіх вершаў: «*Мазыр*», «*Мазырскаму педінстытуту*», «*Плывуць у Мазыр параходы*», «*Мазырскі кірмаш*», «*Мазырскі трамвай*», «*Вартуй, Мазыр*», «*Жанчыне з Мазыра*», «*Прыпяць і Мазыр*», «*Мазырскім медыцынскім сёстрам*», «*Прыпяцкі мост*», «*Над Прыпяццю*», «*Палессе*», «*На Палессі*», «*Палеская вада*» [9, с. 108].

Прырода горада Мазыра адметная тым, што на яго тэрыторыі размешчаны Рэспубліканскі заказнік «*Мазырскія яры*». Тут растуць каля 500 відаў раслін: *бяроза, сасна, дуб, граб, клён, бук, піхта, альха*, а таксама расліны, занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі: *венерын чаравік, гусіная цыбуля, званочак сібірскі, лілія кудраватая.* Ёсць і такія расліны, якія на Беларусі сустракаюцца толькі тут: *эдэльвейс, атлантычнае жыта* [12, с. 240].

Паводле *Іпацьеўскага летапісу* – старажытнага ўсходнеславянскага летапіснага збору – Мазыр вядомы з 1155 г. Запіс засведчыў, што ў гэтым годзе вялікі кіеўскі князь Юрый Далгарукі падарыў горад князю Святаславу Ольгавічу, свайму саюзніку [13, с. 39]. Аднак першыя пасяленні Мазыра ўзніклі значна раней гэтай даты.

Першым паселішчам Мазыра даследчыкі лічаць *Кімбараўку* – цяперашнюю вуліцу Гогаля. Вобраз Кімбараўкі XIX ст. на аднайменным малюнку пакінуў нашчадкам *Напалеон Орда* (1807–1883) [14].

У краязнаўчым музеі і музеі народнай культуры «Палеская веда» госці і жыхары горада могуць пазнаёміцца з вынікамі археалагічных раскопак, якія праводзіліся ў Кімбараўцы. Тут захоўваюцца *бронзавая фібула; бронзавыя паясныя бляшкі; васьмігранная сердалікавая пацерка; калачападобнае крэсіва; керамічны посуд, шыферныя і гліняныя праселкі;* частка *сярэбранага дырхема* (грашовая адзінка Усходніх краін), што была адчаканена ў манетным двары Ал-Мухамедыя ў 798–799 гг. Яны сведчаць пра зносіны Мазыра з важнейшымі гарадамі ўсходніх славян, з Візантыяй і Скандынавіяй [15, с. 37].

Сярод экспанатаў – жаночыя ўпрыгожанні бронзавага веку, амфара XII ст., дакументы і матэрыялы пра рэвалюцыйны рух XIX – пачатку XX ст., падзеі грамадзянскай вайны, пра дзейнасць падполля і партызанскага руху на Мазыршчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны, пра гаспадарчае і культурнае жыццё пасляваеннага часу [5, с. 516].

У музеях экспануюцца таксама бытавы посуд, узоры кафлі, вырабы з косці, металу і шкла, знойдзеныя падчас археалагічных раскопак на гары Камунараў (раней яна называлася Паскай), дзе ў старажытныя часы размяшчаўся *Мазырскі замак*, агульная працягласць умацаванняў якога складала 146 сажняў [16, с. 24].

МГПУ им. И.П. Шамякина

Гісторыкі дэталёва апісваюць печ, што знаходзілася ў адной з *замкавых горніц*. Яна была абкладзена зялёнай паліванай кафляй, з геаметрычным арнаментам, сярэдзіны XVI ст. Верх печы аздаблялі дэкаратыўныя каронкі, на адной з якіх быў выяўлены партрэт жанчыны ў касцюме эпохі Рэнесансу – т. зв. «*мазырская мадонна*» [16, с. 39].

Вежы замка адноўлены. Адсюль можна паназіраць за бліжэйшымі кварталамі горада, у т. л. за плошчай Леніна, рачнымі і прырэчнымі краявідамі.

У XII–XIII стст. Мазыр – адзін з самых буйных гарадоў *Тураўскага княства*. Знаходзячыся на шляху заваёўнікаў, якія ішлі з поўдня і паўднёвага ўсходу, ён неаднаразова падвяргаўся нападам іншаземцаў. У 1497 г. яго захапілі і разрабавалі крымскія татары. Паўторныя іх напады адбыліся ў 1508 г. і ў 1521 г., калі Мазыр быў спалены. Адноўлены горад зноў быў спалены ў 1648 годзе. На гэты раз пажар учыніла войска гетмана *Януша Радзівіла* (дзяржаўнага і вайсковага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага) [17, с. 40].

На пачатку XV ст. Мазыр вядомы як гандлёва-рамеснае пасяленне ў складзе ВКЛ. Паступова побач з Мазыром утвараліся іншыя, вясковыя пасяленні людзей. У 1413 годзе горад увайшоў у склад Мінскага ваяводства. Мазырскія гандляры мелі вялікія сувязі з Кіевам, Пінскам, Брэстам, Польшчай, Прыбалтыкай [17, с. 35].

У 1527 г. мяшчане былі вызвалены ад грашовай, мядовай, бабровай дані з-за татарскага нашэсця, а 28 студзеня 1577 г., згодна з прывілеем караля Стэфана Баторыя, Мазыр атрымаў *магдэбургскае права* і герб, прататыпам якога стаў родавы герб Радзівілаў: чорны арол, на грудзях якога змешчаны малы шчыт з гербам «Трубы» (мазырскімі старастамі з 1550 да 1607 г. былі прадстаўнікі роду Радзівілаў). Пазней на малым шчыце з'явілася літара S – манаграма Стэфана Баторыя [17, с. 25].

Архіўныя дакументы сведчаць, што ў Мазыры ў канцы XVIII ст. дзейнічала 5 праваслаўных цэркваў: Мікольская; Міхайлаўская; Спаская (Праабражэння Гасподняга); Прасвятой Багародзіцы; Пятніцкая або Св. Параскевы (на плане горада 1769 г. будынак гэтай царквы адзначаны ў раёне, дзе зараз размяшчаецца гасцініца «Прыпяць»). Разам з праваслаўнымі ў горадзе жылі базыльяне, бернардзінцы, езуіты, кармеліты і марыявіткі, цыстэрцыянцы, існавала сінагога [19, л. 1].

Адным з брэндаў Мазыра, безумоўна, з'яўляецца Свята-Міхайлаўскі кафедральны сабор, які вядомы і як рэзідэнцыя епіскапа Тураўскага і Мазырскага. Ён быў заснаваны намеснікам Стэфанам Лозкай 25 чэрвеня 1645 г. як *кляштар бернардзінцаў*. Маршалак мазырскі *Казімір Аскерка* «адбудаваў касцёл з грунту» ў стылі позняга барока ў 1760–1778 гг. 16 ліпеня 1775 г. адбылося асвячэнне храма ў гонар Міхаіла Архангела. Пад алтарнай часткай, так званай *крыптай*, хавалі знатных жыхароў Мазыра. Некалькі надмагільных пліт буйнога шляхецкага *роду Аскеркаў* захавалася тут да нашага часу. У 1865 г. сабор быў асвечаны ў гонар архістраціга Міхаіла [17, с. 328]. Сёння ў адным з пакояў скляпення сабора дзейнічае царкоўны музей ахвяраў сталінскага тэрору.

*Жаночы кляштар* быў створаны на пачатку XVIII ст. У 1895–1920 гг. у яго будынках працавала першае буйное прадпрыемства горада – запалкавая фабрыка, на якой выпускаліся шведскія запалкі. У 1928 г. у будыках кляштара размясцілася мэблевая фабрыка «*Прафінтэрн*», перайменаваная пазней у адкрытае акцыянернае таварыства *«Мазырдрэў»*.

У 1905 годзе ў горадзе была створана *Мазырская Рэспубліка,* якую ўзначаліў выбраны рэвалюцыйны камітэт і якая праіснавала 9 дзён [17, с. 71]. Больш ніводзін горад Беларусі не вызначыўся падобнай падзеяй.

На вуліцы Саета, каля лесвіцы, што вядзе ў галоўны корпус універсітэта, – помнік ахвярам Вялікай Айчыннай вайны. Над адным з узгоркаў Мазыра велічна ўзвышаецца *Курган Славы,* дзе гарыць Вечны агонь у памяць аб тых, каму жыхары горада ўдзячныя за сваё жыццё, дзе пахаваны ўдзельнікі вызвалення Мазыра 14 студзеня 1944 г. (*Мазырска-Калінкавіцкая аперацыя*), а таксама ахвяры двухгадовай акупацыі горада. Тут пахаваны і Героі Савецкага Саюза, якія вызвалялі горад.

Вуліцы горада носяць імёны Герояў Саваецкага Саюза: *А. Рыжкова* – камандзіра роты 29-га гвардзейскага стралковага палка 12-й гвардзейскай стралковай дывізіі 61-й арміі Цэнтральнага фронту, які вывеў з акружэння сваю роту падчас бітвы за Дняпро; *М. Катаева*, які вызначыўся ў баі за Дняпро; *В. С. Няжнова,* які неаднаразова асабістым прыкладам узнімаў байцоў у атаку, а ў рашучы момант замяніў у баі выбыўшага са строю палітрука [17, с. 304].

Адна з вуліц носіць імя славутага *Фёдара Міхайлавіча Языковіча*, які ўзначаліў у сакавіку 1943 года штаб партызанскіх атрадаў Палескай вобласці [17, с. 266]. Вуліца *М. С. Малініна* названа ў гонар Міхаіла Сяргеевіча Малініна, арганізатара і кіраўніка падпольнага і партызанскага руху на тэрыторыі Палескай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

МДПУ ім. І.П. Шамякіна

У назве адной з вуліц захоўваецца памяць пра Гаўрыіла Саета – удзельніка руска-японскай вайны, урача горада Мазыра з 1905 года, які ўсе сілы і веды аддаваў барацьбе з распаўсюджанымі ў той час сярод насельніцтва Мазыршчыны інфекцыйнымі хваробамі (тыфам, воспай, дыфтэрыяй, ліхаманкай, сухотамі). Але і сам не ўбярогся, захварэў на тыф і неўзабаве памёр [17, с. 91].

Гімназія, што знаходзіцца на вуліцы Якуба Коласа, носіць імя Народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Цікава тое, што навучальная ўстанова атрымала яго яшчэ ў 1926 г. Тады вучні сямігадовай школы № 3 (папярэдніцы гімназіі) звярнуліся да паэта з просьбай дазволіць навучальнай установе насіць яго імя. І Купала згадзіўся [20, с. 89].

Назва горада-пабраціма з Чэхіі – *Страканіцэ* – знайшла адлюстраванне ў назве бульвара *Страканіцкі.*

Імёны многіх людзей сталі брэндамі Мазыра, у якім яны жылі або працавалі. Так, Мазыр з'яўляецца радзімай заслужанага дзеяча мастацтваў БССР *Пятра Дурчына* (1918–1997), карціны якога на тэму абароны Брэсцкай крэпасці («*Брэсцкая крэпасць», «Брэсцкая крэпасць-герой», «Зоркі бессмяротнасці», «Салдаты Брэста»*) шырока вядомы грамадскасці. У Мазыры ў 1921 годзе нарадзіўся рускі літаратуразнавец *Іосіф Вайнберг,* дзякуючы якому былі знойдзены многія звесткі пра жыццё і творчасць М. Горкага [21].

Горад на Прыпяці вывеў у жыццё легендарную рэвалюцыянерку-народніцу *Гесю Гельфман* [17, с. 74].

З Мазыром звязаны лёс вядомага дзеяча ВКЛ, пісьменніка, дыпламата *Піліпа Казіміра Абуховіча* (1600–1656), які быў намеснікам мазырскага кашталяна. У 1632 г. ён быў выбраны паслом ад Мазырскага павета ў Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага [18, с. 29].

Настаўнікам на Мазыршчыне працаваў *Аляксандр Казіміравіч Сержпутоўскі* (1864–1940) – беларускі этнограф і фалькларыст, удзельнік 25 этнаграфічных, антрапалагічных, лінгвістычных экспедыцый, аўтар 45 навуковых прац [22, с. 350].

Беларускі і рускі этнограф, пісьменнік, журналіст, публіцыст і тэатральны крытык *Павел Міхайлавіч Шпілеўскі* (1823–1861) вядомы тым, што ў 1850 г. наведаў Мазыр, а свае назіранні апісаў у дзённіку.

Этнограф, фалькларыст, правадзейны член Інбелкульта (1922), член Паўночна-Заходняга аддзела Рускага геаграфічнага таварыства *Ісак Абрамавіч Сербаў* (1871–1943) у 1910–1912 гг. наладзіў шэраг экспедыцый па Беларусі, у т. л. па Мазыршчыне, даследуючы курганы дрыгавічоў [12, с. 344].

Актыўная віцебская падпольшчыца перыяду Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза *Вера Захараўна Харужая* (1903–1942) з шасцігадовага ўзросту расла і выхоўвалася ў Мазыры. Тут прайшлі яе дзіцячыя і юнацкія гады [17, с. 548].

У музычны кантэкст сацыяльна-моўнага партрэта горада ўнеслі сваю лепту народны артыст, дырыжор *Міхаіл Якаўлевіч Фінберг* (1947–2021); спявачка, тэлевядучая, журналіст *Ксенія Міхайлаўна Сітнік* (нарадзілася ў 1995 г. у Мазыры) – пераможца дзіцячага конкурсу міжнароднага музычнага фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» і міжнароднага песеннага конкурсу «Дзіцячае Еўрабачанне – 2005»; мастак-кераміст, Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларускай ССР, удзельнік шматлікіх мастацкіх выставак, у т. л. міжнародных, *Мікалай Мікітавіч Пушкар* (1919–1993), музей-майстэрню з мастацкімі шэдэўрамі якога охвотна наведваюць людзі розных узростаў. Вырабы мастака адлюстроўваюць прыгажосць і пяшчоту душы простага беларуса, яго мудрасць, пачуццё гумару, аптымізм, працавітасць і талент.

На культурнае жыццё жыхароў горада ўплывае дзейнасць *драматычнага тэатра імя Івана Мележа, кінатэатра, мастацкіх выставак*, якія рэгулярна праходзяць у выставачнай зале горада, а таксама ў цэнтральнай раённай бібліятэцы імя А. С. Пушкіна.

У 2006 г. сям'я Кузняцовых заснавала ў горадзе гурток па падрыхтоўцы цыркавых артыстаў з ліку дзяцей. Іх заняткам спрыяе наяўнасць цыркавой арэны. Дзейнасць юных талентаў – гэта брэнд не толькі Мазыра, але і краіны. Артысты цырка з поспехам выступаюць як на радзіме, так і за мяжой: у Італіі, Кітаі, Расіі, Казахстане, Ізраілі, Літве, Латвіі, ва Украіне, на Кубе.

Мазыр таксама вядомы тым, што тут праходзілі здымкі мастацкіх фільмаў «*Дзеці партызана*», «*Дзяўчынка шукае бацьку*», «*Крыніцы*», «*Заўтра будзе позна*» [18, с. 223].

Спорт і спартыўныя мерапрыемствы займаюць значную частку жыцця горада. Тут знаходзіцца футбольны клуб «*СЛАВІЯ*», які станавіўся чэмпіёнам Беларусі ў 1996 і 2000 гг. [18, с. 233]. У горадзе працуе гарналыжны комплекс, ідзе да завяршэння будаўніцтва фізкультурна-аздараўляльнага цэнтра «*Палессе-Арэна*».

МГПУ им. И.П. Шамякина

Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна выхаваў цэлую плеяду алімпійскіх чэмпіёнаў. Сярод іх – *Артур Сяргеевіч Літвінчук, Алег Алегавіч Юрэня, Дзяніс Алегавіч Гаража, Каміла Бобр, Маргарыта Рыгораўна Махнева, Джавіт Шакіравіч Гамзатаў.* Значны ўклад у іх падрыхтоўку зрабіў кіраўнік Рэспубліканскай федэрацыі па грэблі на каноэ і байдарках, трэнер *Уладзімір Уладзіміравіч Шантаровіч.*

Сучасны Мазыр – буйны прамысловы цэнтр. У ім працуюць прадпрыемствы нафтаперапрацоўчай, машынабудаўнічай, металаапрацоўчай, дрэваапрацоўчай, лёгкай, харчовай прамысловасці. Так, з 1975 г. дзейнічае *Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод,* які выпускае тэхнічны *бутан, бензін, дызель, бытавы газ, звадкаваны газ, бітум, мазут, газу, серу тэхнічную, паліва для пячэй* [17, с. 498]. З 1982 года працуе завод «*Мазырсоль*», асноўнай прадукцыяй якога з'яўляюцца *харчовая і тэхнічная соль, соль з ёдам, у выглядзе таблетак, соль для пасудамыйных машын* [17, с. 499]. Мазырская швейная фабрыка «*Надэкс*» пачала сваю дзейнасць у 1944 годзе і з таго часу з'яўляецца асноўнай вытворцай мужчынскіх кашуль [18, с. 488]. З 1959 г. розныя віды *провадy* і *кабелю* выпускае *Мазырскі кабельны завод. Касілкі, пагрузчыкі, маніпулятары, пад'ёмнікі* вырабляюцца на *Мазырскім машынабудаўнічым заводзе.* У Мазыры працуюць таксама *дрэваапрацоўчы камбінат, мэблевая фабрыка, спіртагарэлачны завод, фабрыка мастацкіх вырабаў, малочны завод і завод бялкова-вітамінных канцэнтратаў* і інш. [23, с. 251].

**Заключэнне**

Сістэмна-навуковы падыход да вызначэння сацыяльна-моўнага партрэта горада Мазыра – сэрца Усходняга Палесся – праз яго асноўныя рэсурсныя каштоўнасці як турысцкай тэрыторыі дазволіў выявіць унікальныя аб'екты дадзенай тэрыторыі, якія маюць несумненны інтарэс для турыстаў. Турыстычны брэндынг горада ўключае этымалогіі яго назвы, перыфразы; назвы літаратурных твораў, у якіх апісваецца горад; тапонімы – намінацыі прыродных, гістарычных, археалагічных, культурных, адукацыйных, спартыўных аб'ектаў і звязаных з імі рэалій; эргонімы – назвы прадпрыемстваў і арганізацый; намінатыўныя адзінкі прадукцыі, якую яны выпускаюць; гадонімы – назвы вуліц; антрапонімы – імёны і прозвішчы знакамітых людзей, чый лёс так або інакш звязаны з горадам.

Даследаванне будзе карысным пры стварэнні слоўніка турыстычнага брэндынгу, дапаможа распрацаваць турысцкія і экскурсійныя маршруты ў межах горада Мазыра і можа быць выкарыстана як узор для вызначэння сацыяльна-моўных партрэтаў іншых гарадоў Беларусі.

СПІС АСНОЎНЫХ КРЫНІЦ

1. Важенина, И. С. Имидж и репутация территории / И. С. Важенина // Региональная экономика. – 2006. – № 23. – С. 2–12.

2. Шапиро, С. В. Брендинг в сфере туризма [Электронный ресурс] / С. В. Шапиро // Концепт : науч.-метод. электронный журн. – 2017. – Т. 21. – С. 68–72. – Режим доступа: http://e-koncept.ru/2017/770419.htm. – Дата доступа: 09.01.2024.

3. Шалыгина, Н. П. О роли брендинга в формировании туристской привлекательности региона / Н. П. Шалыгина, М. В. Селюков, Е. В. Курач // Фундаментальные исследования. – 2013. – № 8–5. – С. 1165–1168.

4. Панкрухин, А. П. Маркетинг территорий / А. П. Панкрухин. – 2-е изд., доп. – СПб. : Питер, 2006. – 416 с.

5. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996–2004. – Т. 9. – 1999. – 560 с.

6. Цыхун, Г. А. Пра назвы некаторых беларускіх гарадоў / Г. А. Цыхун // Род. слова. – 2011. – № 10. – С. 33–36.

7. Рогалеў, А. Ф. Сцежкі ў даўніну: геаграфічныя назвы Беларускага Палесся / А. Ф. Рогалеў. – Мінск : Полымя, 1992. – 159 с.

8. Шпилевский, П. Мозырщина / П. Шпилевский // Нёман. – 1996. – № 9. – С. 212–251.

9. Шур, В. Малая і вялікая радзіма ў анамастыконе пісьменнікаў / В. Шур, В. Слівец. – Мазыр : Мазыр. дзярж. пед. ун-т, 2019. – 170 с.

10. Шур, В. В. Анамастыкон Палесся ў паэзіі Уладзіміра Верамейчыка / В. В. Шур // Род. слова. – 2007. – № 11. – С. 26–29.

11. Верамейчык, У. Клянусся Прыпяццю: паэзія / Уладзімір Верамейчык. – Мінск : Маст. літ., 1988. – 191 с.

МГПУ им. И.П. Шамякина

12. Туристские регионы Беларуси / редкол.: Г. П. Пашков ; под общ. ред. И. И. Пирожника ; худ.: В. И. Терентьев, Ю. А. Тореев. – Минск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2008. – 608 с.

13. Ткачев, М. А. Замки Беларуси / М. А. Ткачев. – Минск : Беларусь, 2002. – 200 с.

14. Несцярчук, А. М. Напалеон Орда. Шлях да Бацькаўшчыны / А. М. Несцярчук. – Мінск : Маст. літ., 2012. – 430 с.

15. Залашка, Г. М. Кімбараўскае гарадзішча / Г. М. Залашка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1983. – № 4. – С. 37–38.

16. Трусаў, А. А. Археалагічныя даследаванні / А. А. Трусаў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1982. – № 2. – С. 39–40.

17. Памяць: гісторыка.-дакументальная хроніка Мазыра і Мазырскага раёна / уклад.: М. А. Капач, В. Р. Феранц. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Маст. літ., 1997. – 574 с.

18. Мазыр, 850 год : у 3 т. / Мазыр. дзярж. пед. ун-т ; пад агул. рэд. І. Ф. Штэйнера. – Гомель : Сож, 2005. – Т. 1 : Гісторыя і сучаснасць / С. В. Целяпень [і інш.]. – 351 с.

19. План г. Мозыря 1825 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 1477. Воп. 1. Спр. 1662. Арк. 1.

20. Мазуркевіч, А. А. Традыцыі ў выхаваўчай прасторы гімназіі як сродак фарміравання нацыянальнай свядомасці гімназістаў / А. А. Мазуркевіч // Православие и отечественная культура: потери и приобретения минувшего, образ будущего : материалы X Туровских епархиальных образовательных чтений / УО МГПУ им. И. П. Шамякина ; редкол.: Т. Н. Сыманович, М. М. Щербин (отв. ред.) [и др.]. – Мозырь : МГПУ им. И. П. Шамякина, 2023. – С. 89–90.

21. Мазыр, 850 год : у 3 т. / Мазыр. дзярж. пед. ун-т ; пад агул. рэд. І. Ф. Штэйнера. – Гомель : Сож, 2005. – Т. 2 : Мазыр літаратурны / І. Ф. Штэйнер [і інш.]. – 214 с.

22. Касько, У. К. Сержпутоўскі Аляксандр Казіміравіч / У. К. Касько // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн., 1996–2004. – Т. 14 : Рэле–Слаявіна. – 2002. – 512 с.

23. Зборнік помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гомельская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1985. – 383 с.

*Паступіў у рэдакцыю 20.03.2024*

E-mail: katarina.kovalchuk@gmail.com

K. Matusevich

## SOCIO-LINGUISTIC PORTRAIT OF THE CITY IN TOURISM BRANDING (USING THE EXAMPLE OF THE CITY OF MOZYR)

The article (using the example of the city of Mozyr) examines the socio-linguistic portrait of the city through its main resource values in tourism branding. A systems approach to determining the socio-linguistic portrait of the city of Mozyr – the heart of the Eastern Polesie – has made it possible to identify unique objects of this territory that arouse tourists' visiting interest: the most interesting etymological information, distinctive natural places, historical monuments, cultural, religious, sports, and industrial objects.

Keywords: etymology of the name, paraphrases, history, archeology, street names, architecture, cultural objects, enterprises.

МГПУ им. И.П. Шамякина